*У. А. Жылко,*
*аспірант, Беларускі дзяржаўны*
*ўніверсітэт культуры і мастацтваў*

# ХРЫСЦІЯНСКІЯ КАШТОЎНАСЦІ ЯК МАРАЛЬНА-РЭГУЛЯТЫЎНАЯ АСНОВА МЕНТАЛІТЭТУ

Безумоўная значнасць духоўных каштоўнасцей у хрысціянскім свеце грунтуецца на разуменні, што асновай сусвету з’яўляецца Бог як вярхоўная Асоба, і разуменні каштоўнасці як абсалютнага дабра.

Хрысціянскія каштоўнасці выступаюць у якасці маральнага ідэалу, ацэначнай асновы ва ўсіх сферах жыццядзейнасці соцыуму. Найбольш цікавым у гэтым дачыненні падаецца даследаванне хрысціянскай абумоўленасці менталітэту, паколькі рэлігія (у тым ліку і хрысціянства) займае цэнтральнае месца ў працэсе канструявання сэнсаў, ведаў, кагнетыўнага комплексу, які арыентуе чалавека ў жыцці. Так, у кантэксце выяўлення менталітэту беларускага народа хрысціянскія каштоўнасці як дамінантныя маральныя сродкі-рэгулятывы прадстаўлены трыма групамі:

1) Каштоўнасці, якія раскрываюць адносіны чалавека да знешняга свету.

Хрысціянскія запаведзі, прынцыпы паводзін, нормы і ацэнкі як законы маральнага самаўдасканалення чалавека адлюстроўваюць сістэмныя сувязі паміж унутраным светам чалавека і навакольным светам, паміж самімі людзьмі. Дасягненне маральнага ідэалу ў вобразе Ісуса Хрыста прадугледжвае рэалізацыю прадстаўніком народа ў сваім паўсядзённым жыцці маральных форм паводзін, зносін і дзейнасці, канстытуяваных у хрысціянскіх запаведзях. Духоўны ідэал «выяўляе пазачасавую сутнасць чалавека, мае аб’ектыўны надасабовы характар і цесна звязаны з Вышэйшым Дабром, ці Богам» [2, с. 33]. Вера ў Бога сімвалізуе вечнасць, з’яўляецца каштоўнасным арыенцірам, своеасаблівым пунктам адліку абсалютнай сістэмы каардынат, вакол якога працякае жыццё чалавека з усімі яго прыватнымі каштоўнасцямі. Каштоўнасныя арыентацыі беларусаў грунтаваліся на спрадвечных хрысціянскіх запаведзях. У Богу бачыцца перш за ўсё звышнатуральная сіла – абаронца і караючаю далонь, – якая вызначае лёс, папярэджвае людзей пра сваю волю праз таямнічыя знакі. Паводле М. Крукоўскага, ідэя Бога мае ўніверсальны характар і ў ёй, як у вяршыні піраміды, канцэнтруюцца як законы прыроды, так і ўсе ідэалы і духоўныя каштоўнасці чалавецтва [1, с. 17].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2) Каштоўнасці, якія адлюстроўваюць асобаснае стаўленне чалавека да сацыяльнай рэчаіснасці (любоў як галоўнае маральнае пачуццё і стан, духоўна-маральныя мэты, матывы, установкі і каштоўнасныя арыентацыі).

Вядома, што цэнтральнай каштоўнасцю хрысціянства, яго вызначальным пастулатам з’яўляецца любоў. Менавіта любоў да бліжняга выступае аб’ядноўваючым фактарам, трывалым падмуркам чалавечага жыцця, каштоўнаснай першаасновай. Хрысціянскія каштоўнасці, якія канструююць адносіны чалавека да рэчаінсасці і да самога сябе, заснаваны на прынцыпе ахвярнай любові і добразычлівага стаўлення да ўсіх людзей. Каштоўнасць любові як галоўнага маральнага стану і пачуцця, якое абумоўлівае духоўна-маральныя мэты, матывы, памкненні, установкі і сэнсажыццёвыя арыентацыі хрысціянства, вызначае асабістае стаўленне да рэчаіснасці. Каштоўнасць ахвярнай любові разумеецца ў хрысціянскай філасофіі як аснова ўсіх астатніх хрысціянскіх каштоўнасцей, квінтэсэнцыя духоўнага і маральнага самаўдасканалення.

Рэлігійна-маральная матывацыя ў многім вызначае паводзіны беларуса ў яго стваральнай дзейнасці і ў паўсядзённым жыцці, з цягам часу яна сфарміравала асаблівыя адносіны да працы і гаспадарчай дзейнасці ў цэлым. Праца ў хрысціянскай традыцыі спрадвеку выступала адным з галоўных сродкаў выратавання душы. Сама праца лічылася каштоўнасцю ў тым выпадку, калі яна была блаславёная – гэта значыць з’яўлялася своеасаблівым супрацоўніцтвам з самім Богам, садзейнічала паспяховаму выкананню яго задумы адносна свету і чалавека. Працавітасць лічыцца адной з самых станоўчых і дамінуючых рыс характару беларуса. Як слушна заўважае Ю. В. Чарняўская, успрыманне жыцця як працы ў беларускай народнай культуры звязана з тым, што такі лад жыцця быў дадзены Богам, які таксама ўспрымаўся беларусам як майстар і творца, адмысловы руплівы гаспадар над усім існым [3, с. 153].

3) Рэфлексіўныя каштоўнасці, якія выражаюць стаўленне асобы да самой сябе і свайго ўнутранага свету (годнасць, сумленне, свабода, імкненне да самаўдасканалення, маральная самасвядомасць).

Каштоўнасці самавыхавання і самадысцыплінаванасці як маральныя сродкі-рэгулятывы ў межах беларускага менталітэту накіраваны на свядомае самаабмежаванне чалавекам свайго

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дэструктыўнага пачатку і пераадоленне любога негатыўнага ўздзеяння звонку. Да такіх вышэйшых каштоўнасцей можна аднесці любоў, свабоду, ісціну, дабро, пачуццё абавязку, сумленне, таму што ўсе яны характарызуюць ступень узыходжання чалавека да хрысціянскага ідэалу, годнасць і свабоду асабістага выбару. Выступаючы ў якасці істотнага праяўлення чалавечага існавання, гэтыя каштоўнасці з'яўляюцца паказчыкамі духоўнасці чалавека, узаемнай адказнасці людзей.

Хрысціянская каштоўнасць – імкненне да самаўдасканалення – фарміруе вектар, які накіроўвае жыццё чалавека на рэалізацыю ўсяго патэнцыялу яго духоўнасці. Каштоўнасць любові да бліжняга – да іншага чалавека, які знаходзіцца побач у дадзены момант, роўна як і цярпімасць, з'яўляюцца стрыжнем хрысціянскай маральнасці. Любоў і цярпімасць фарміруюцца на аснове рэфлексіўных каштоўнасцей: усведамлення сваёй годнасці, сумленасці, свабоды волі, імкнення да самаўдасканалення. У сістэме хрысціянскіх каштоўнасцей духоўна-маральнаму развіццю і пастаяннаму творчаму самаўдасканаленню адпавядае сэнс чалавечага існавання.

Такія каштоўнасці, як любоў да бліжняга, праца і яе вынік, сям'я, дом, зямля, уяўляюць сабой «формулу» выжывання чалавека і палягаюць у аснову менталітэту беларусаў. Вынік жыцця кожнага чалавека ўсіх гістарычных эпох у рознатыповых культурах залежыць найперш ад рэалізацыі (здзяйснення) сэнсажыццёвых каштоўнасцей – яны раскрываюць мэту і сэнс жыцця, уяўляюць сабой праграмму жыццядзейнасці прадстаўніка этнасу. Гэтыя каштоўнасці выступаюць у выглядзе сінтэзу светаразумення і практыкі. Такім чынам, маральна-рэгулюючая роля хрысціянскіх каштоўнасцей як асновы менталітэту заключаецца ў тым, што яны пры бесперапынным узнаўленні сацыякультурнай рэальнасці народа садзейнічаюць падтрыманню яго ідэнтычнасці і самакаштоўнасці.

1. *Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры : уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

2. *Сорокин, П. А.* Социальная и культурная динамика / П. А. Сорокин. – М. : Астрель, 2006. – 1176 с.

3. *Чернявская, Ю. В.* Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. В. Чернявская. – Мінск : ФУАинформ, 2010. – 510 с

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ